Источник: "Культура" - 2013-04-20

# Варыянты вяртання фаліянтаў

**Выстаўка "Кніжная спадчына Радзівілаў" у Нацыянальным гісторыка-культурным музеі-запаведніку "Нясвіж" — падзея ў пэўным сэнсе сімвалічная. Выступоўцы на цырымоніі адкрыцця згадвалі драматычны лёс збораў славутага роду.**

Сёння большая частка бібліятэкі Радзівілаў знаходзіцца па-за межамі Беларусі — у Расіі, Фінляндыі, Польшчы, Літве. І вось, нарэшце, частка кніг вярнулася ў родныя сцены. Хай сабе нават і на часовае экспанаванне…

Сёння ў Беларусі ідзе праца па вывучэнні і вяртанні ў культурную і навуковую сферы кніжных скарбаў славутага роду. Дзякуючы намаганням спецыялістаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі выйшаў у свет каталог "Бібліятэка Радзівілаў Нясвіжскай ардынацыі", які ахоплівае звесткі па XVII стагоддзі. Гэта кніга другая ў выдавецкай серыі. Першая была прысвечана XVI стагоддзю. Праца будзе мець працяг, пра што і паведаміў на прэзентацыі, якая адбылася ў час адкрыцця выстаўкі, загадчык аддзела рэдкай кнігі і рукапісаў ЦНБ Аляксандр Стэфановіч.

Радзівілаўскія кнігі, згаданыя ў каталогу, належаць сёння Цэнтральнай навуковай бібліятэцы. Што ж да фаліянтаў, якія знаходзяцца па-за межамі Беларусі, дык вяртаць іх сёння можна хіба што віртуальна — у выглядзе электронных копій. Перамовы пра тое ўжо вядуцца.

Старшыня Беларускага фонду культуры Уладзімір Гілеп не губляе надзеі на тое, што калі-небудзь раскіданыя па свеце часткі Радзівілаўскай бібліятэкі вернуцца ў Нясвіжскі палац не віртуальна, а насамрэч.

Рэжысёр Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь Віктар Скорабагатаў згадаў ролю, якую адыграў Нясвіж у гісторыі музычнай культуры



Беларусі. У бібліятэцы палаца захоўваліся не толькі кнігі, але і ноты, а з творчасці Уршулі Радзівіл, як вядома, фактычна пачалася наша опера. Сёння рыхтуецца да выдання анталогія лібрэта беларускай опернай сцэны. Першы том ахоплівае час ад 1752 да 1924 года — ад дзейнасці той самай Уршулі Радзівіл да ўтварэння ў савецкі час опернай студыі пры Беларускім музычным тэхнікуме. Другі том — час ад 1924 года да нашых дзён. Гэта анталогію спадар Скорабагатаў разглядае як падарунак да 80-гадовага юбілею нашага тэатра. Будзе такая кніга не лішняй і ў бібліятэцы Нясвіжскага палаца.

**Пётра ВАСІЛЕЎСКІ,**
**наш спецыяльны карэспандэнт**
**Мінск — Нясвіж — Мінск**

Пётра Васілеўскі. Варыянты вяртання фаліянтаў